**ДУК Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2025 г.

## Мерапрыемствы да Дня сталага чалавека

**1.10.2025г.**

У рамках бібліятэчнага праекта «От милосердия в книгах - к неравнодушию в жизни» у філіяле «Дзівінская сельская бібліятэка» прайшла літаратурна - музычная кампазіцыя «Днём мудрости зовётся этот день».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**2.10.2025г.**

Філіял «Магдалінская сельская бібліятэка» правёў бібліятэчныя вячоркі «Когда молод душой человек». Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава-агляд «В гармонии с возрастом». Ансамбль гарманістаў «Кобрынскі гармонік» выступіў з музычнымі віншаваннямі: песнямі, найгрышамі, прыпеўкамі.

Філіял «Магдалінская сельская бібліятэка»

**2.10.2025г.**

Літаратурна-музычны калейдаскоп «Возраст мудрости, тепла и доброты» прайшоў у чытальнай зале ЦРБ. Прагучалі музычныя нумары ад бібліятэчнай вакальнай групы «Фантазия», вакальнага калектыву «Вечарніца» Кобрынскага ТЦСАН і Дзмітрыя Іванова, які пражывае ў пансіянаце «Никольский».

ЦРБ

## Мерапрыемствы ў рамках Тыдня бацькоўскай любові

**15.10.2025г.**

У чытальнай зале ЦРБ да Дня маці прайшла духоўна-паэтычная гадзіна «Под покровом небесной любви». Гасцямі сустрэчы сталі: урач акушэр-гінеколаг Кобрынскай ЦРБ Вольга Мароз, святар Свята-Хрыстовай Царквы Андрэй Шаўчук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Кандрашук. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Во имя наших матерей». Завяршылася мерапрыемства песняй «Берегите родных» у выкананні Наталлі Раманюк.

ЦРБ

**15.10.2025г.**

Філіял «Магдалінская сельская бібліятэка» арганізаваў літаратурна-музычную сустрэчу «Ваш праздник сердечной улыбкой увенчан», прысвечаную Дню маці. Гасцямі мерапрыемства сталі: протаіерэй Сергій Кіслюк і прадстаўнік Кіселявецкага сельскага савета Віктар Кірылюк. Вакальныя калектывы «Зараніца» і «Кобрынскі гармонік» выступілі з музычнымі віншаваннямі.

Філіял «Магдалінская сельская бібліятэка»

**16.10.2025г.**

У чытальнай зале ЦРБ прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Родительский дом - начало начал». Яркай старонкай свята стала выступленне таленавітай артысткі з Дзівінскага цэнтра культуры і вольнага часу Таццяны Брыштэль, дырэктара Хабовіцкага Дома культуры Вольгі Гурыч, бібліятэкара Дзівінскай публічнай бібліятэкі Таццяны Гурыш, а таксама Людмілы Боцех і Ангеліны Марчук. Далучыліся да віншаванняў паэты літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Алена Котава, Марына Міхалюк і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук.

ЦРБ

**17.10.2025г.**

У філіяле «Дзіцячая бібліятэка» прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Родительской любовью мы согреты». У бібліятэцы аформлены кніжныя выставы «Доброе слово - мама» і «Главная ценность на свете - это семья и дети».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка»

**Мерапрыемствы ў рамках раённага бібліятэчнага конкурсу на лепшую квест-гульню «Люблю мой край, старонку гэту»**

**3.10.2025г.**

У рамках раённага краязнаўчага конкурсу «Люблю мой край, старонку гэту» у філіяле «Арэхаўская сельская бібліятэка» прайшла квэст-гульня «Путешествие по родному краю».

Філіял «Арэхаўская сельская бібліятэка»

**13.10.2025г.**

У філіяле «Астроміцкая сельская бібліятэка» прайшла краязнаўчая квэст-гульня «Всему начало здесь - в краю моём родном».

Філіял «Астроміцкая сельская бібліятэка»

**<u>Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Мы здоровое поколение Брестчины»</u>**

**8.10.2025г.**

У рамках акцыі «Мы здоровое поколение Брестчины» у філіяле «Тэвельская сельская бібліятэка» прайшоў урок здароўя «Здоровье дороже всего». Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава «Мы – за здоровый образ жизни».

Філіял «Тэвельская сельская бібліятэка»

**9.10.2025г.**

У філіяле «Дзіцячая бібліятэка» праведзена гадзіна здароўя «Здоровый я - здоровая страна». Да мерапрыемства работнікі бібліятэкі афармілі тэматычную выставу «Учись быть здоровым», на якой прадстаўлены кнігі, буклеты, лістоўкі па прафілактыцы здаровага ладу жыцця.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка»

**15.10.2025г.**

У філіяле «Імянінская сельская бібліятэка» прайшла гадзіна карысных парад «Наше здоровье - в наших руках». Да мерапрыемства была падрыхтавана тэматычная выстава «ЗДОРОВЫМ быть здОрово!».

Філіял «Імянінская сельская бібліятэка»

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

**10.10.2025г.**

Спецыялістамі аддзела маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы выдадзены «Каляндар юбілейных і памятных дат на 2026 год у дапамогу планаванню работы бібліятэк».

ЦРБ

**24.10.2025г.**

Супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Кобрынскай РЦБС падрыхтавана 2-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае, інфармацыйна-бібліяграфічнага бюлетэня «Водныя шляхі Кобрынскага краю» з цыкла «Па старонках календара нашай памяці».

ЦРБ

**28.10.2025.**

У чытальнай зале ЦРБ праведзены літаратурны вечар «С любовью в сердце. Сергей Есенин», прысвечаны 130-годдзю знакамітага паэта. У мерапрыемстве актыўны ўдзел прыняла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук. Чытачы бібліятэкі на працягу вечара з задавальненнем чыталі вершы С. Ясеніна.

Выканаўца
Чопік Д. І.
3 85 81